Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар УА «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
______________Ю. П. Бондар
«____»_____________2013 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____ /вуч.

# ЭТНАФАНІЧНЫ ПРАКТЫКУМ
## Раздзел 1. Клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць*
*(па напрамках), напрамку спецыяльнасці*
*1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор),*
*спецыялізацыі 1-18 01 01-05 01 Этнафоназнаўства*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2013

**Складальнік**

*В. В. Калацэй,* загадчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*Т. А. Кухаронак,* старшы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», кандыдат гістарычных навук;

*І. М. Грамовіч,* дацэнт кафедры беларускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 12 ад 14.06.2012 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 24.09.2012 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск *В. В. Калацэй*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Этнафанічны практыкум» складаецца з двух раздзелаў: «Клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства» і «Этнафонія». Дадзеная праграма прызначана для вывучэння першага раздзела «Клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства».

Тэматыка заняткаў вучэбнай дысцыпліны «Клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства» накіравана на ўдакладненне ў свядомасці будучых спецыялістаў па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны месца практычнай фалькларыстыкі ў навуковым дыскурсе пра чалавека і чалавецтва. Змест дысцыпліны мае на ўвазе набліжэнне сучасных студэнтаў-гуманітарыяў да практычнага разумення спецыфікі музычнага мыслення носьбітаў карэннай культуры Беларусі і фарміравання спеўных і інструментальна-выканальніцкіх уменняў і навыкаў спецыялістаў-ахоўнікаў і даследчыкаў яе музычнага фальклору.

Раздзел «Клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства» вучэбнай дысцыпліны «Этнафанічны практыкум» цесна звязаны з такімі дысцыплінамі, як «Беларуская этнамузыкалогія», «Методыка экспедыцыйных этнамузыкалагічных даследаванняў», паколькі ўводзіць студэнтаў у кантэкст асноўных базавых паняццяў практычнай фалькларыстыкі, веданне спецыфікі якіх неабходна для аптымізаванай дзейнасці будучых даследчыкаў і транслятараў фальклору. Разам з тым курс мае ў асяродку роднасных дысцыплін адмысловае месца, паколькі яго змест будзе выкарыстаны ў практычна-педагагічнай, арганізацыйнай дзейнасці выпускнікоў спецыяльнасці «народная творчасць» напрамку спецыяльнасці «народная творчасць (фальклор)» спецыялізацыі «этнафоназнаўства».

*Мэта* дысцыпліны – азнаямленне са спецыфікай беларускай этнафоніі праз раскрыццё асаблівасцей сцэнічнай адаптацыі музычнага фальклору.

*Задачы* дысцыпліны:

– пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі паняццямі і тэрміналогіяй вывучаемай дысцыпліны;

– засвоіць веды па гісторыі фарміравання практычнай музычнай фалькларыстыкі як асобнай навуковай галіны;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– раскрыць патэнцыял музычных фальклорных помнікаў для этнаэкалогіі беларусаў і для рэвіталізацыі іх нематэрыяльнай культурнай спадчыны;

– сфарміраваць прафесійную кампетэнцыю даследчыкаў і пераемнікаў (забяспечыць разуменне спецыфікі і значнасці музычнай фальклорнай спадчыны для практычнай дзейнасці па яе захаванні) у іх будучай прафесійнай дзейнасці.

У выніку вывучэння дысцыпліны «Клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства» студэнт павінен *ведаць:*

– асноўныя тэарэтычныя паняцці, разгледжаныя ў межах дадзенай дысцыпліны;

– асноўныя падыходы да класіфікацыі музычных фальклорных адзінак па відах і жанрах;

– агульную характарыстыку, структуру, змест і гістарычную панараму фарміравання і бытавання музычнага мастацтва вуснай традыцыі Беларусі;

*умець:*

– выконваць песні, інструментальныя найгрышы на мінімум адным музычным інструменце, рытмізаваныя рухі (характэрныя для традыцыйнага сенсітыпу беларусаў), перанятыя ад носьбітаў фальклору ці з відэа- і аўдыякрыніц;

– праводзіць этнафанічны, гульнявы трэнінг у фальклорным калектыве;

– аналізаваць помнікі музычнага фальклору з пункта гледжання іх прыналежнасці да той ці іншай храналагічнай ці відавой сістэмы;

– карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай па пытаннях дысцыпліны.

Метады навучання ў рамках дадзенай дысцыпліны адпавядаюць агульным патрабаванням да фарміравання прафесійных кампетэнцый студэнта. Метадалагічнымі асновамі дысцыпліны з’яўляюцца тлумачальна-ілюстрацыйныя, рэпрадуктыўныя метады (расказ, дэманстрацыя адзінак музычнага фальклору для пераймання, тлумачэнне, гутарка, дыскусія, лекцыя, дэманстрацыя кіна- і аўдыязапісаў), праблемныя (творчы дыялог, назіранне), метады самастойнай работы студэнтаў (работа з першакрыніцамі, расшыфроўка аўдыя- і відэаматэрыялаў, развучванне песень, інструментальных найгрышаў, рытмізаваных рухаў), кантрольна-ацэначныя метады (адказы і творчыя паказы на кантрольных занятках).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Самастойная работа студэнтаў накіравана на замацаванне практычных уменняў па дысцыпліне і ўключае наступныя заданні: работа з даследчай і вучэбна-метадычнай літаратурай; фарміраванне медыятэк; работа з дакументацыяй па выяўленні і наданні статусу гісторыка-культурнай спадчыны; прагляд відэаматэрыялаў паводле спецыфікі працы, наведванне канцэртаў, выставак народнай творчасці.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне раздзела «Клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства» вучэбнай дысцыпліны «Этнафанічны практыкум» прадугледжана 414 гадзін, з якіх 188 гадзін – аўдыторныя заняткі (180 г. – практычныя заняткі, 8 г. – індывідуальныя заняткі).

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў – залік, экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | практ. | інд. |
| **Уводзіны** | | 2 | |
| **Раздзел І. Практыка фальклорнага выканальніцтва** | | | |
| ***Тэма 1.*** Стылі выканання фальклору | | 4 | |
| ***Тэма 2.*** Склад фальклорнага гурту | | 4 | |
| ***Тэма 3.*** Беларускі фальклор у ХХ ст. | | 4 | |
| ***Тэма 4.*** Беларускі фальклор у пачатку ХХІ ст. | | 6 | |
| ***Тэма 5.*** Фальклор і постфальклор | | 4 | |
| ***Тэма 6.*** Маладзёжны фальклорны рух | | 6 | |
| **Раздзел ІІ. Выкананне спеўнага фальклору** | | | |
| ***Тэма 7.*** Вакальны трэнінг у фальклорным гурце | | 4 | |
| ***Тэма 8.*** Рэгіянальныя асаблівасці спеўнага фальклорнага выканальніцтва | | 6 | |
| ***Тэма 9.*** Выкананне спеўнага фальклору ў розных камунікатыўных сітуацыях | | 4 | |
| ***Тэма 10.*** Формульныя спевы і спевы з імправізацыяй | | 6 | 4 |
| ***Тэма 11.*** Спевы з шумавым акампанементам | | 4 | |
| ***Тэма 12.*** Спевы з носьбітамі фальклорнай традыцыі | | 6 | |
| **Раздзел ІІІ. Выкананне спеўнага фальклору на сцэне** | | | |
| ***Тэма 13.*** Сцэнічная адаптацыя спеўнага фальклору | | 4 | |
| ***Тэма 14.*** Сцэнічная адаптацыя як сродак папулярызацыі спеўнага фальклору | | 6 | |
| ***Тэма 15.*** Пабудова праграмы пры сцэнічным выкананні спеўнага фальклору | | 4 | |
| ***Тэма 16.*** Акустыка сцэны і месцазнаходжанне спевакоў у час выступленняў | | 6 | |
| ***Тэма 17.*** Патрабаванні да спеўнага гурту на фальклорных фестывалях | | 4 | |
| ***Тэма 18.*** Патрабаванні да спеўнага гурту на зборных канцэртах | | 6 | |
| **Раздзел ІV. Выкананне музычна-інструментальнага фальклору на сцэне** | | | |
| ***Тэма 19.*** Сцэнічная адаптацыя музычна-інструментальнага фальклору | | 4 | 4 |
| ***Тэма 20.*** Сцэнічная адаптацыя як сродак папулярызацыі музычна-інструментальнага фальклору | | 6 | |
| ***Тэма 21.*** Пабудова праграмы пры сцэнічным выкананні музычна-інструментальнага фальклору | | 4 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| ***Тэма 22.*** Акустыка сцэны і месцазнаходжанне музыкаў-інструменталістаў у час выступленняў | | 6 | |
| ***Тэма 23.*** Патрабаванні да музычна-інструментальнага гурту на фальклорных фестывалях | | 4 | |
| ***Тэма 24.*** Патрабаванні да музычна-інструментальнага гурту на зборных канцэртах | | 6 | |
| **Раздзел V. Выкананне харэаграфічнага фальклору** | | | |
| ***Тэма 25.*** Пластычны трэнінг у фальклорным гурце | | 4 | |
| ***Тэма 26.*** Беларускія карагоды | | 6 | |
| ***Тэма 27.*** Лексіка побытавага танца і выканальніцтва фальклору | | 4 | |
| ***Тэма 28.*** Рэгіянальныя асаблівасці харэаграфічнага фальклорнага выканальніцтва | | 6 | |
| ***Тэма 29.*** Выкананне харэаграфічнага фальклору ў розных камунікатыўных сітуацыях | | 4 | |
| ***Тэма 30.*** Рэжым харэаграфічных рухаў у закрытых памяшканнях і ў натуральным ландшафце | | 6 | |
| **Раздзел VI. Выкананне харэаграфічнага фальклору на сцэне** | | | |
| ***Тэма 31.*** Сцэнічная адаптацыя харэаграфічнага фальклору | | 4 | |
| ***Тэма 32.*** Сцэнічная адаптацыя як сродак папулярызацыі харэаграфічнага фальклору | | 6 | |
| ***Тэма 33.*** Адбор рэпертуару для сцэнічнай адаптацыі харэаграфічнага фальклору | | 4 | |
| ***Тэма 34.*** Пабудова праграмы пры сцэнічным выкананні харэаграфічнага фальклору | | 6 | |
| ***Тэма 35.*** Патрабаванні да харэаграфічнага гурту на фальклорных фестывалях | | 4 | |
| ***Тэма 36.*** Патрабаванні да харэаграфічнага гурту на зборных канцэртах | | 6 | |
| **Разам …** | **188** | **180** | **8** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны. Сувязь дысцыпліны з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі. Роля дысцыпліны ў падрыхтоўцы спецыялістаў. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне.

## Раздзел І. Практыка фальклорнага выканальніцтва

### *Тэма 1. Стылі выканання фальклору*

Фальклор як мастацтва вуснай традыцыі. Вусная перадача фальклорных адзінак як абавязковая ўмова існавання фальклору. Механістычнае капіраванне, стылізацыя, рэканструкцыя як прыступкі да пошуку адэкватных форм працы з фальклорам. Аўтэнтычны фальклор як ідэал і крыніца розных форм фальклярызму. Выкананне беларускіх народных гульняў «Явар», «Цяцерка» як сродак фарміравання спантаннага, нязмушанага далучэння да фальклору дзяцей і моладзі.

### *Тэма 2. Склад фальклорнага гурту*

Узроставыя і гендарныя характарыстыкі фальклорных гуртоў. Узроставыя і гендарныя характарыстыкі ўдзельнікаў фальклорнага гурту як перадумова фарміравання рэпертуару і агульнай накіраванасці калектыву. Салісты і звычайныя ўдзельнікі фальклорнага гурту. Роля салістаў і спантанных лідараў у фарміраванні рэпертуару і агульнай накіраванасці калектыву. Выкананне беларускіх народных гульняў «Жаніцьба Цярэшкі», «Яшчур» як сродак фарміравання спантаннага, нязмушанага далучэння да фальклору дзяцей і моладзі.

### *Тэма 3. Беларускі фальклор у ХХ ст.*

Выканальніцкія кірункі ў фальклоры ХХ ст. Аўтэнтычны фальклор і мастацкая самадзейнасць у форме трохсастаўнага народнага хору. Аўтэнтычны фальклор як прыклад трансляцыі мастацтва вуснай традыцыі і захавання ўзораў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Мастацкая самадзейнасць як вопыт спалучэння мастацтва вуснай і пісьмовай традыцыі. Выкананне беларускіх народных гульняў «Хто за горадам гуляе», «Падушачка» як сродак фарміравання спантаннага, нязмушанага далучэння да фальклору дзяцей і моладзі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 4. Беларускі фальклор у пачатку XXI ст.*

Выканальніцкія кірункі ў фальклоры ў пачатку XXI ст. Аўтэнтычны фальклор і мастацкая самадзейнасць пад пільнай увагай даследчыкаў. Фарміраванне пад уздзеяннем фальклорнага руху XX ст. постфальклорных выканаўцаў, эксперыментальных фальклорна-сцэнічных і фальклорна-эстрадных выканаўцаў. Выкананне беларускіх народных гульняў «Грушка», «Мак» як сродак фарміравання спантаннага, нязмушанага далучэння да фальклору дзяцей і моладзі.

*Тэма 5. Фальклор і постфальклор*

Фальклор і постфальклор як формы мастацтва вуснай традыцыі. Адрозненні паміж імі ў асяродку існавання, гендарных і ўзроставых характарыстыках іх носьбітаў. Найбольш яскравыя прыклады фальклору і постфальклору. Выкананне беларускай народнай гульні «Чачотка» як сродак фарміравання спантаннага, нязмушанага далучэння да фальклору дзяцей і моладзі.

*Тэма 6. Маладзёжны фальклорны рух*

Маладзёжны фальклорны рух як масавая з’ява культурнай сітуацыі другой паловы XX ст. ва ўрбаністычных асяродках еўразійскага рэгіёна. Галоўныя сімвалы і рухальныя сілы фальклорнага руху. Спантаннасць і нязмушанасць далучэння да фальклорнага руху. Выкананне беларускай народнай гульні «Ружа» як сродак фарміравання спантаннага, нязмушанага далучэння да фальклору дзяцей і моладзі.

## Раздзел II. Выкананне спеўнага фальклору

*Тэма 7. Вакальны трэнінг у фальклорным гурце*

Асаблівасці вакальнага трэнінгу ў фальклорным калектыве як асяродку трансляцыі мастацтва вуснай традыцыі. Затраты часу пры спантанна-адвольным і пры дыдактычна вывераным фарміраванні традыцыйнага гукаідэалу. Выкананне беларускіх народных песень «Каваль», «Як па лесе я гуляла» як сродак фарміравання традыцыйнага гукаідэалу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 8. Рэгіянальныя асаблівасці спеўнага фальклорнага выканальніцтва*

Адмысловасць фальклорнай адзінкі як помніка нематэрыяльнай культурнай спадчыны пэўнага гісторыка-культурнага рэгіёна Беларусі. Арыентаванасць на мастацтва вуснай традыцыі пэўнага рэгіёна як абавязковая ўмова дзейнасці фальклорнага гурту. Выкананне беларускіх народных прыпевак да гульняў «Жаніцьба Цярэшкі», «Яшчур» як сродак фарміравання традыцыйнага гукаідэалу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі.

### *Тэма 9. Выкананне спеўнага фальклору ў розных камунікатыўных сітуацыях*

Фальклор, мастацтва вуснай традыцыі як функцыянальны дадатак да стандартных жыццёвых сітуацый каляндарных цыклаў і цыкла жыцця чалавека. Камунікатыўны бок фальклору як актуальны сродак камунікацыі нават пры знікненні ці мадэрнізацыі традыцыйнага ладу жыцця. Выкананне беларускіх народных песень «Паздароў, Божа, таго каваля», «Іскарка-прыгаўка», «А ў полі бяроза» як сродак фарміравання традыцыйнага гукаідэалу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі.

### *Тэма 10. Формульныя спевы і спевы з імправізацыяй*

Формульныя напевы каляндарных і сямейна-абрадавых песень як знакі-сімвалы традыцыйнай камунікацыі і помнікі нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Спеўны стыль і манера як характарыстыкі фальклорнага выканальніцтва і спосабы самавыяўлення адмысловых і звычайных спевакоў. Выкананне беларускіх народных песень «За Сібірам да сонца ўсходзіць», «Купала на Івана» як сродак фарміравання традыцыйнага гукаідэалу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі.

### *Тэма 11. Спевы з шумавым акампанементам*

Сінкрэтызм фальклорнага выканальніцтва, у якім арганічна спалучаюцца вакальны, рухальны, гукаімітацыйны спосабы самавыяўлення. Сродкі шумавога акампанемента ў беларускай этнаграфічнай традыцыі. Шумавое суправаджэнне ў абрадавых і гульнявых сітуацыях. Выкананне прыпевак да беларускіх народных гульняў «Грушка», «Мак» як сродак фарміравання традыцыйнага гукаідэалу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 12. Спевы з носьбітамі фальклорнай традыцыі*

Этнафор – носьбіт фальклору як крыніца слыхавой, артыкуляцыйнай, фанетычнай, эмацыянальнай інфармацыі пра традыцыйны гукаідэал. Этапы сумеснага з этнафорам выканання песень: інфармацыйна-падрыхтоўчы, камунікатыўны, аналітычны. Выкананне беларускіх народных песень «Выганяй, маці, каваля з хаты», «Ой ты, сонца» як сродак фарміравання традыцыйнага гукаідэалу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі.

## Раздзел III. Выкананне спеўнага фальклору на сцэне

### *Тэма 13. Сцэнічная адаптацыя спеўнага фальклору*

Умовы сацыялізацыі захавальніка фальклору ў сучасным вузкапрафіяналізаваным грамадстве. Нарматыўныя (арганізацыйныя, дыдактычныя, канцэртныя) патрабаванні да фальклорнага калектыву з боку адміністрацыі ўстановы культуры, адукацыі, пазашкольнага навучання і выхавання. Выкананне прыпевак да беларускіх народных танцаў «Кракавяк», «Базар» як сродак фарміравання традыцыйнага гукаідэалу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі ва ўмовах сцэнічнай практыкі.

### *Тэма 14. Сцэнічная адаптацыя як сродак папулярызацыі спеўнага фальклору*

Інфармацыйная аўдыяпрастора і месца ў ёй народнай песні. Патрабаванні (акустычныя, рэпертуарныя, тэхнічныя) да сцэнічных выканаўцаў спеўнага фальклору. Прафесіяналізацыя спеўных калектываў маладзёжнага фальклорнага руху напрыканцы XX ст.: страты і дасягненні. Выкананне прыпевак да беларускага народнага танца «Лявоніха» як сродак фарміравання традыцыйнага гукаідэалу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі ва ўмовах сцэнічнай практыкі.

### *Тэма 15. Пабудова праграмы пры сцэнічным выкананні спеўнага фальклору*

Сцэнічныя выступленні як мэта і сродак жыццядзейнасці фальклорнага спеўнага калектыву – небяспека падмены паняццяў. Патрабаванні (часовыя, тэмпарытмічныя, рэжысёрскія) да сцэнічнага выступлення і спецыфіка спеўнага фальклору.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прынцыпы пабудовы канцэртнай спеўнай праграмы – акустычны разлік, драматургія, кантраснасць, разнажанравасць, выкарыстанне тэхнічных сродкаў (экранных, гукавых, сцэнаграфічных). Выкананне прыпевак да беларускага народнага танца «Верабей» як сродак фарміравання традыцыйнага гукаідэалу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі ва ўмовах сцэнічнай практыкі.

### *Тэма 16. Акустыка сцэны і месцазнаходжанне спевакоў у час выступленняў*

Фальклорныя спевы – спевы ў натуральнай акустыцы. Выбар сцэнічнай пляцоўкі, зыходзячы з гэтай асаблівасці спеўнага фальклору. Патрабаванні да гукаўзмацняльнай апаратуры пры адсутнасці натуральных акустычных умоў. Пабудова ўласнай акустычнай мадэлі сродкамі карэкцыі месцазнаходжання спевакоў на сцэне. Выкананне прыпевак да беларускіх народных гульняў «Хто за горадам гуляе», «Падушачка» як сродак фарміравання традыцыйнага гукаідэалу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі ва ўмовах сцэнічнай практыкі.

### *Тэма 17. Патрабаванні да спеўнага гурту на фальклорных фестывалях*

Адрозненні фальклорных фестываляў ад фестываляў мастацкай самадзейнасці і музычных фестываляў (статут, мэты, этыка ўдзельнікаў). Абавязковае суаднясенне сезона правядзення фестывалю са спеўным рэпертуарам фестывальнага выступлення. Уласны рэгіянальны рэпертуар як умова ўдзелу ў фальклорным фестывалі. Выкананне прыпевак да беларускага народнага танца «Сербіянка» як сродак фарміравання традыцыйнага гукаідэалу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі ва ўмовах сцэнічнай практыкі.

### *Тэма 18. Патрабаванні да спеўнага гурту на зборных канцэртах*

Патрабаванні (часовыя, тэмпарытмічныя, рэжысёрскія) да зборнага канцэрта і спецыфіка спеўнага фальклору. Прынцыпы пабудовы канцэртнай мініпраграмы – акустычны разлік, драматургія, кантраснасць, разнажанравасць. Падбор «непрымерkаваных» песень як аснова сцэнічнага рэпертуару. Выкананне беларускіх народных песень «Пасею гурочкі», «Зялёны дубо-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чак» як сродак фарміравання традыцыйнага гукаідэалу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі ва ўмовах сцэнічнай практыкі.

## Раздзел IV. Выкананне музычна-інструментальнага фальклору на сцэне

### *Тэма 19. Сцэнічная адаптацыя музычна-інструментальнага фальклору*

Інфармацыйная аўдыяпрастора і месца ў ёй народнай інструментальнай музыкі. Патрабаванні (акустычныя, рэпертуарныя, тэхнічныя) да сцэнічных выканаўцаў музычна-інструментальнага фальклору. Прафесіяналізацыя музычна-інструментальных калектываў маладзёжнага фальклорнага руху напрыканцы XX ст.: страты і дасягненні. Выкананне найгрышаў да беларускага народнага танца «Кракавяк» як сродак фарміравання навыкаў калектыўнага музіцыравання пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі ва ўмовах сцэнічнай практыкі.

### *Тэма 20. Сцэнічная адаптацыя як сродак папулярызацыі музычна-інструментальнага фальклору*

Інфармацыйная аўдыяпрастора і месца ў ёй народнай інструментальнай музыкі. Патрабаванні (акустычныя, рэпертуарныя, тэхнічныя) да сцэнічных выканаўцаў музычна-інструментальнага фальклору. Прафесіяналізацыя музычна-інструментальных калектываў маладзёжнага фальклорнага руху напрыканцы XX ст.: страты і дасягненні. Выкананне найгрышаў да беларускага народнага танца «Базар» як сродак фарміравання навыкаў калектыўнага музіцыравання пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі ва ўмовах сцэнічнай практыкі.

### *Тэма 21. Пабудова праграмы пры сцэнічным выкананні музычна-інструментальнага фальклору*

Сцэнічныя выступленні як мэта і сродак жыццядзейнасці фальклорнага музычна-інструментальнага калектыву – небяспека падмены паняццяў. Патрабаванні (часовыя, тэмпарытмічныя, рэжысёрскія) да сцэнічнага выступлення і спецыфіка музычна-інструментальнага фальклору. Прынцыпы пабудовы канцэртнай музычна-інструментальнай праграмы – акустычны разлік, драматургія, кантраснасць, разнажанравасць, выкары-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

станне тэхнічных сродкаў (экранных, гукавых, сцэнаграфічных). Выкананне найгрышаў да беларускага народнага танца «Лявоніха» як сродак фарміравання навыкаў калектыўнага музіцыравання пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі ва ўмовах сцэнічнай практыкі.

### *Тэма 22. Акустыка сцэны і месцазнаходжанне музыкаў-інструменталістаў у час выступленняў*

Фальклорная інструментальная музыка – музыка ў натуральнай акустыцы. Выбар сцэнічнай пляцоўкі, зыходзячы з гэтай асаблівасці музычна-інструментальнага фальклору. Патрабаванні да гукаўзмацняльнай апаратуры пры адсутнасці натуральных акустычных умоў. Пабудова ўласнай акустычнай мадэлі сродкамі карэкцыі месцазнаходжання музыкаў-інструменталістаў на сцэне. Выкананне найгрышаў да беларускага народнага танца «Верабей» як сродак фарміравання навыкаў калектыўнага музіцыравання пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі ва ўмовах сцэнічнай практыкі.

### *Тэма 23. Патрабаванні да музычна-інструментальнага гурту на фальклорных фестывалях*

Адрозненні фальклорных фестываляў ад фестываляў мастацкай самадзейнасці і музычных фестываляў (статут, мэты, этыка ўдзельнікаў). Абавязковае суаднясенне сезона правядзення фестывалю з музычна-інструментальным рэпертуарам фестывальнага выступлення. Уласны рэгіянальны рэпертуар і характэрны музычны інструментарый як умова ўдзелу ў фальклорным фестывалі. Выкананне найгрышаў да беларускай народнай гульні «Падушачка» як сродак фарміравання навыкаў калектыўнага музіцыравання пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі ва ўмовах сцэнічнай практыкі.

### *Тэма 24. Патрабаванні да музычна-інструментальнага гурту на зборных канцэртах*

Патрабаванні (часовыя, тэмпарытмічныя, рэжысёрскія) да зборнага канцэрта і спецыфіка музычна-інструментальнага фальклору. Прынцыпы пабудовы канцэртнай мініпраграмы – акустычны разлік, драматургія, кантраснасць, разнажанравасць. Падбор «непрымеркаваных» найгрышаў як аснова сцэнічнага рэпертуару. Выкананне найгрышаў да беларускай на-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

роднай гульні «Цяцерка» як сродак фарміравання навыкаў калектыўнага музіцыравання пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі ва ўмовах сцэнічнай практыкі.

## Раздзел V. Выкананне харэаграфічнага фальклору

### *Тэма 25. Пластычны трэнінг у фальклорным гурце*

Асаблівасці пластычнага трэнінгу ў фальклорным калектыве як асяродку трансляцыі мастацтва вуснай традыцыі. Затраты часу пры спантанна-адвольным і пры дыдактычна выверaным фарміраванні традыцыйнага рухальнага сенсітыпу. Выкананне беларускіх народных танцаў «Кракавяк», «Базар» як сродак фарміравання традыцыйнага рухальнага сенсітыпу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі.

### *Тэма 26. Беларускія карагоды*

Традыцыйныя карагоды як крыніца розных відаў мастацтва. Сінкрэтызм карагодаў. Гендарныя і ўзроставыя характарыстыкі выканаўцаў карагодаў у Беларусі. Карагод-кола і крывы танок – асноўныя віды беларускіх карагодаў. Выкананне беларускіх народных карагодаў «Страла», «Ой, лука мая» як сродак фарміравання традыцыйнага рухальнага сенсітыпу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі.

### *Тэма 27. Лексіка побытавага танца і выканальніцтва фальклору*

Традыцыйныя і побытавыя танцы як наступствы розных відаў дзейнасці. Побытавы танец як даступны і дэмакратычны від фарміравання традыцыйнага рухальнага сенсітыпу. Гендарныя і ўзроставыя характарыстыкі выканаўцаў побытавых танцаў у Беларусі. Сольныя, парныя танцы і танцы з няцотнай колькасцю выканаўцаў – асноўныя віды беларускіх побытавых танцаў. Выкананне беларускага народнага танца «Верабей» як сродак фарміравання традыцыйнага рухальнага сенсітыпу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі.

### *Тэма 28. Рэгіянальныя асаблівасці харэаграфічнага фальклорнага выканальніцтва*

Адмысловасць харэаграфічнай фальклорнай адзінкі як помніка нематэрыяльнай культурнай спадчыны пэўнага гісторыка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурнага рэгіёна Беларусі. Арыентаванасць на мастацтва вуснай традыцыі пэўнага рэгіёна як абавязковая ўмова дзейнасці фальклорнага харэаграфічнага гурту. Выкананне беларускіх народных танцаў «Шахцёр», «Дзева ў сенях стаяла» як сродак фарміравання традыцыйнага рухальнага сенсітыпу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі.

### *Тэма 29. Выкананне харэаграфічнага фальклору ў розных камунікатыўных сітуацыях*

Харэаграфічны фальклор, мастацтва вуснай традыцыі як функцыянальны дадатак да стандартных жыццёвых сітуацый каляндарных цыклаў і цыкла жыцця чалавека. Камунікатыўны бок харэаграфічнага фальклору як актуальны сродак камунікацыі нават пры знікненні ці мадэрнізацыі традыцыйнага ладу жыцця. Выкананне беларускага народнага танца «Сербіянка» як сродак фарміравання традыцыйнага рухальнага сенсітыпу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі.

### *Тэма 30. Рэжым харэаграфічных рухаў у закрытых памяшканнях і ў натуральным ландшафце*

Характар накіраванасці на «затаптванне», прытоп «па зямлі» многіх асноўных харэаграфічных малюнкаў і рухаў беларусаў. Залежнасць амплітуды харэаграфічных рухаў ад месца і ўмоў выканання танца. Выкананне беларускіх народных танцаў «Мікіта», «Зайчык-чыбірайчык» як сродак фарміравання традыцыйнага рухальнага сенсітыпу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі.

## Раздзел VI. Выкананне харэаграфічнага фальклору на сцэне

### *Тэма 31. Сцэнічная адаптацыя харэаграфічнага фальклору*

Абставіны сацыялізацыі захавальніка харэаграфічнага фальклору ў сучасным вузкапрафіяналізаваным грамадстве. Нарматыўныя (арганізацыйныя, дыдактычныя, канцэртныя) патрабаванні да харэаграфічнага фальклорнага калектыву з боку адміністрацыі ўстановы культуры, адукацыі, пазашкольнага навучання і выхавання. Выкананне беларускіх народных танцаў «Падэспань», «Ліцьвінка» як сродак фарміравання традыцый-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нага рухальнага сенсітыпу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі ва ўмовах сцэнічнай практыкі.

### *Тэма 32. Сцэнічная адаптацыя як сродак папулярызацыі харэаграфічнага фальклору*

Інфармацыйная відэапрастора і месца ў ёй народнай харэаграфіі. Патрабаванні (візуальныя, рэпертуарныя, тэхнічныя) да сцэнічных выканаўцаў харэаграфічнага фальклору. Прафесіяналізацыя харэаграфічных калектываў маладзёжнага фальклорнага руху напрыканцы ХХ ст.: страты і дасягненні. Выкананне беларускіх народных танцаў «Грачанікі», «Джанджоха» як сродак фарміравання традыцыйнага рухальнага сенсітыпу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі ва ўмовах сцэнічнай практыкі.

### *Тэма 33. Адбор рэпертуару для сцэнічнай адаптацыі харэаграфічнага фальклору*

Выкананне беларускіх народных танцаў «Картузэ», «Какетка» як сродак фарміравання традыцыйнага рухальнага сенсітыпу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі ва ўмовах сцэнічнай практыкі.

### *Тэма 34. Пабудова праграмы пры сцэнічным выкананні харэаграфічнага фальклору*

Сцэнічныя выступленні як мэта і сродак жыццядзейнасці фальклорнага харэаграфічнага калектыву – небяспека падмены паняццяў. Патрабаванні (часовыя, тэмпарытмічныя, рэжысёрскія) да сцэнічнага выступлення і спецыфіка харэаграфічнага фальклору. Прынцыпы пабудовы канцэртнай харэаграфічнай праграмы – драматургія, кантраснасць, разнажанравасць, выкарыстанне тэхнічных сродкаў (экранных, гукавых, сцэнаграфічных). Выкананне беларускіх народных танцаў «Полька “Янка”», «Палеская кадрыля» як сродак фарміравання традыцыйнага рухальнага сенсітыпу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі ва ўмовах сцэнічнай практыкі.

### *Тэма 35. Патрабаванні да харэаграфічнага гурту на фальклорных фестывалях*

Адрозненні фальклорных харэаграфічных фестываляў ад фестываляў мастацкай самадзейнасці і харэаграфічных конкурсаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і фестываляў (статут, мэты, этыка ўдзельнікаў). Уласны рэгіянальны харэаграфічны рэпертуар як умова ўдзелу ў фальклорным фестывалі. Выкананне беларускіх народных танцаў «Лысы», «Аколіца» як сродак фарміравання традыцыйнага рухальнага сенсітыпу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі ва ўмовах сцэнічнай практыкі.

### *Тэма 36. Патрабаванні да харэаграфічнага гурту на зборных канцэртах*

Патрабаванні (часовыя, тэмпарытмічныя, рэжысёрскія) да зборнага канцэрта і спецыфіка харэаграфічнага фальклору. Прынцыпы пабудовы канцэртнай харэаграфічнай мініпраграмы – драматургія, кантраснасць, разнажанравасць. Падбор «непрымеркаваных» танцаў як аснова сцэнічнага рэпертуару. Выкананне беларускіх народных танцаў «Карапэт», «Нарэчанька» як сродак фарміравання традыцыйнага рухальнага сенсітыпу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі ва ўмовах сцэнічнай практыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Гусев, В. Е.* Эстетика фольклора / В. Е. Гусев / АН СССР, Ин-т рус. литературы. – Л. : Наука, 1967. – 319 с.

2. *Калацэй, В. В.* Ад укладальніка / В. В. Калацэй // Штудыі Рэспубліканскай сезоннай фальклорнай школы / уклад. В. В. Калацэй; рэдкал.: В. В. Калацэй (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2007. – С. 4–8.

3. *Можейко, З. Я.* Календарно-песенная культура Белоруссии : Опыт системно-типологического исследования / З. Я. Можейко. – Минск : Навука і тэхніка, 1985. – 247 с.

4. *Назіна, І. Д.* Беларускія народныя музычныя інструменты / І. Д. Назіна. – Мінск : Беларусь, 1997. – 239 с. : іл.

5. *Саракаік, І.* Беларусазнаўства / І. Саракаік. – Мінск : Веды, 1998. – 284 с.

6. *Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў : у 6 т. Т. 1 : Магілёўскае Падняпроўе / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка [і інш.] – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 321 с.

7. *«Этнашкола»* ў сучасным адукацыйным працэсе : вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / уклад. і навук. рэд. праф. І. І. Сучкоў. – Мінск : Бестпринт, 2004. – 274 с.

*Дадатковая*

1. *Календарные* обычаи и обряды в странах зарубежной Европы : Весенние праздники / ред. С. А. Токарев. – М. : Наука, 1977. – С. 30–36, 46–50.

2. *Пладунова, Т.* Рухомы фэст «Па святах “Сонечнага крыжа”» : сацыяльны запыт і канцэпцыя / Т. Пладунова // Штудыі Рэспубліканскай сезоннай фальклорнай школы / уклад. В. В. Калацэй ; рэдкал.: В. В. Калацэй (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2007. – С. 22–27.

3. *Рычкуце, М.* Умовы дзейнасці ўстаноў культуры постсавецкай прасторы, перапрафіляваных у этнакультурныя цэнтры : Віленскі этнакультурны цэнтр на пачатку XXI стагоддзя / М. Рычкуце // Штудыі Рэспубліканскай сезоннай фальклорнай школы / уклад. В. В. Калацэй ; рэдкал.: В. В. Калацэй (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2007. – С. 16–21.

4. *Чистов, К. В.* Народные традиции и фольклор / К. В. Чистов. – Л. : Наука, 1986. – 274 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

– падрыхтоўка прэзентацый;

– падрыхтоўка пісьмовых кантрольных работ (заданняў);

– напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;

– напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі па асобных тэмах дысцыпліны;

– вуснае апытанне студэнтаў на семінарах па распрацаваных тэмах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ЭТНАФАНІЧНЫ ПРАКТЫКУМ**
**Раздзел 1. Клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства**

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць*
*(па напрамках), напрамку спецыяльнасці*
*1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор),*
*спецыялізацыі 1-18 01 01-05 01 Этнафоназнаўства*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2013. Фармат $60x84^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,22. Ул.-выд. арк. 0,77. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ